ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● NO.24 (3432) ● ЧАЦВЕР, 25 ЧЭРВЕНЯ, 2015

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: **WWW.GOLAS.BY**

“Купалінка” і “Лицей”
Дзень Расіі святкавалі ў Тальяці з беларускімі песнямі ды рускімі танцамі Стар. 2

Шляхам святла і прыгажосці
Мастачка з беларускім родавымі каранямі Любоў Тарлецкая, якая жыве ў Латвіі, прысвяціла сваю выставу святіцелю Мікалаю Цудатворцу Стар. 3

Музычныя дыялогі з Кракавам
Кампазітар Яўген Паплаўскі не толькі піша музыку, але і паглыбляе пры яе дапамозе беларуска-польскае культурнае супрацоўніцтва Стар. 4

ЯК СПРАВЫ, ДЫЯСПАРА?

ВІТАЛІЙ МАЗУР

На святкаванне дня нараджэння беларускай суполкі ў Кішынёве сабраліся яе актывісты і сябры

З першым годам!

Важнымі набыткамі адзначыла гадавіну дзейнасці маладая суполка — Беларускі культурны рух Малдовы

Чытачы “Голасу Радзімы” ведаюць: БКРМ — гэта маладое аб’яднанне беларускай дыяспары Малдовы. У працы грамадскай суполкі ўдзельнічаюць людзі са свежымі поглядамі, ідэямі, якія адносяць сябе да беларускага этнасу ці праяўляюць цікавасць да нашай культуры. Мы ўпэўнены: менавіта культура ва ўсе часы была, ёсць, ды і будзе найлепшым сродкам гарманізацыі міжнацыянальных зносін. Сёння ў нашых шэрагах каля сотні чалавек.

Сваё месца пад сонцам

Урачыстасць з нагоды 1-й гадавіны БКРМ прайшла ў Бюро міжэтнічных адносін Малдовы. Сабралася шмат сяброў суполкі, шаноўных гасцей і прадстаўнікоў этнааб’яднанняў. Гучала нямала цёплых слоў на адрас аб’яднання і яго актыву, а таксама старшыні суполкі, якая нарадзілася 7 чэрвеня. Павіншавалі сяброў-супляменнікаў з добрым і плённым пачынам старшыня Беларускай абшчыны ў Малдове Юры Статкевіч, старшыня Міжнароднага таварыства дружбы і супрацоўніцтва “Малдова—Беларусь” Генадзь Зяньковіч, намеснік старшыні Асацыяцыі беларусаў муніцыпія Кішынёў “Беларусь” Ігар Белакавыльскі, старшыня Грамады ўкраінскіх жанчын у Малдове Валянціна Марару, старшыня Саюза палякаў Малдовы Васіль Казіміровіч ды шмат іншых прадстаўнікоў творчай і навуковай інтэлігенцыі краіны.

Як адзначыў саветнік Пасольства Беларусі ў Малдове Аляксандр Салаўёў, актывістам БКРМ удалося ўжо вельмі многае, на што іншым суполкам спатрэбіліся б гады, улічваючы цалкам валанцёрскую аснову яе дзейнасці. Дыпламат падзякаваў старшыні праўлення за плённую працу пашырэння беларускай культуры ў Малдове, пажадаў актывістам творчых поспехаў на доўгія гады. Актыўныя ўдзельнікі руху ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі за значны ўклад у развіццё суполкі, добрасумленную працу. Асаблівую падзяку і Ганаровыя граматы атрымалі ад старшыні самыя маленькія сябры Руху.

Першы год — гэта мноства значных падзей, мерапрыемстваў, сустрэч. Адладжваем супрацу з шэрагам дзяржаўных і няўрадавых структур у Малдове і Беларусі. У іх ліку — Пасольства Беларусі ў Малдове, Бюро міжэтнічных адносін Малдовы, Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур Беларусі, Міжнароднае згуртаванне беларусаў свету “Бацькаўшчына”, Таварыства па сувязях з суайчыннікамі за мяжой “Радзіма”. Ёсць кантакты з многімі грамадскімі суполкамі ў Малдове, якія прадстаўляюць украінцаў, рускіх, палякаў, латышоў, яўрэяў, балгараў, грузінаў, гагаузаў, азербайджанцаў ды іншыя этнасы. Распачата ўзаемадзеянне з міністэрствамі культуры Беларусі і Малдовы, з Міністэрствам замежных спраў Беларусі ды Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў. І ўжо ёсць станоўчыя вынікі нашых клопатаў. Напрыклад, упершыню ў гісторыі беларускай дыяспары Малдовы медалём Францыска Скарыны ўшанаваны наш зямляк, выдатны мастак Вячаслаў Ігнаценка. А хадайніцтва, радуемся, ініцыявала праўленне БКРМ. ➔ Стар. 4

ВЕСТКІ

Камфорт каштуе нядорага

Мілана Лявонава

Дарагі для многіх сэрцаў Мінск трапіў у дзясятку самых танных для пражывання замежнікаў гарадоў свету

Нью-ёркская кансалтынгавая кампанія Mercer апублікавала чарговы гадавы рэйтынг кошту жыцця для замежнікаў у розных гарадах свету. Мінск апынуўся ў дзясятцы самых танных гарадоў на планеце.

Ёсць прыемныя навіны і для нашых усходніх суседзяў. Масква, якая летась займала 9-е месца, але па дарагоўлі тамтэйшага жыцця, выйшла з першай дзясяткі ды апынулася на 50-м. Санкт-Пецярбург, які размяшчаўся ў 2014-м на 35-м па дарагоўлі месцы, у 2015-м трапіў на 152-е. Эксперты звязваюць гэта з паслабленнем рубля ў адносінах да даляра.

Спіс складзены на падставе параўнання ўзроўню жыцця і цэн у Нью-Ёрку з больш чым 200 гарадамі на пяці кантынентах. У прыватнасці, эксперты ацанілі кошт жылля, транспарту, харчавання, а таксама адзення і забаў. Гэта самае падрабязнае ў свеце параўнальнае даследаванне кошту жыцця выкарыстоўваецца пры разліку кампенсацый для супрацоўнікаў шматнацыянальных кампаній ды ўрадавых устаноў, якія працуюць за мяжой.

Самым дарагім горадам трэці раз запар становіцца сталіца Анголы Луанда. Далей размясціліся Ганконг, Цюрых, Сінгапур і Жэнева. У дзясятку самых дарагіх гарадоў патрапілі таксама Шанхай, Пекін, Сеул, Берн і сталіца Чада Нджамена. Цікава, што ў выніку абясцэньвання мясцовых валют да амерыканскай значна аселі ў рэйтынгу дарагоўлі пражывання і некаторыя гарады Цэнтральнай Еўропы. Але такому “паніжэнню” людзі, натуральна, толькі радуюцца.

ВІНШУЕМ!

Пакрыўджаных не будзе

Кацярына Мядзведская

Падведзены вынікі конкурсу “Культура” сярод суполак беларусаў замежжа на лепшыя культурныя праекты

Конкурс заснаваны Рэспубліканскім цэнтрам нацыянальных культур і Беларускім таварыствам па сувязях з суайчыннікамі за мяжой “Радзіма”. Два гады таму, калі падводзілі вынікі першага конкурсу, я даведаліся пра дзейнасць такіх суполак, як, напрыклад, асацыяцыя “Bellarus” у італьянскім Неапалі, расійская культурная аўтаномія “Беларусы Мурмана”, асацыяцыя беларусаў у Швейцарыі (кіраўнік Аляксандр Сапега) ды іншых. Упершыню на сувязь з РЦНК выйшаў і Цэнтр беларускай мовы і культуры пры Бакінскім славянскім універсітэце, што ў Азербайджане.

Кіраўніца асацыяцыі “Bellarus” Таццяна Пумпулева, пра якую неаднойчы пісалі і ў “Голасе Радзімы”, гаварыла, што даслаць матэрыялы да конкурсу ёй падказалі ў Пасольстве Беларусі ў Рыме. І вельмі радавалася, стаўшы лаўрэатам. З Беларусі супляменнікі тады атрымалі падарункі: каштоўную метадычную літаратуру, дакументальныя фільмы пра краіну, сувеніры і самае галоўнае — беларускі нацыянальны жаночы касцюм. Усё такое неабходнае ў рабоце! З таго часу пачалося і актыўнае ўзаемадзеянне беларускай італьянкі з землякамі. У верасні хор, створаны пры асацыяцыі, удзельнічаў у Другім фестывалі мастацтваў беларусаў свету, Таццяна была ў Мінску і ў снежні — на вучобе-стажыроўцы для кіраўнікоў творчых калектываў беларусаў замежжа. Часта шле яна прывітанні па электроннай пошце, запрашае на старонкі асацыяцыі ў сацсетках, дзе шмат фота, тэкстаў пра жыццё супляменнікаў у Італіі. Удзельнічала асацыяцыя “Bellarus” і ў сёлетнім конкурсе — і таксама паспяхова. Сярод дасланых матэрыялаў я пабачыла мноства фотаздымкаў са святаў Масленіцы, 8 Сакавіка, Калядаў, Купалля, прэзентацый кніг і аўтарскіх выстаў неапальскіх беларусаў. ➔ Стар. 2

КАЦЯРЫНА МЯДЗВЕДСКАЯ

Дыплом — Аляксандру Сапегу

РАЗАМ

“Купалінка” і “Лицей”

Дзень Расіі святкавалі ў Тальяці з беларускімі песнямі ды рускімі танцамі

І Дзень Расіі супляменнікі з Тальяці адзначаюць з беларускай сімволікай

Мне падабаюцца вядомыя радкі паэта Самуіла Маршака: “Мы знаем: время растяжимо./ Оно зависит от того,/ Какого рода содержимым/ Вы наполняете его…”. Для нас, беларусаў Тальяці, кожны новы месяц напоўнены цікавымі творчымі праектамі: выступленні, канцэрты, удзел у святочных імпрэзах… І, вядома ж, хто працуе — таму і ўзнагароды прыйдуць, і грамадскае прызнанне. Мне ж вельмі прыемна было атрымаць на пачатку месяца Ганаровы знак мэра “За заслугі перад гарадской акругай Тальяці”. Чым “напоўнена” ўзнагарода? За ёй — 10 гадоў напружанай працы: мы зберагаем, пашыраем, перадаем маладым беларускія традыцыі, далучаем тысячы людзей да гісторыі, культуры, абрадаў сваіх супляменнікаў. Суполка — у пастаянным развіцці, у многіх гарадскіх, абласных і міжнародных імпрэзах удзельнічаюць творчыя гурты “Купалінка” і “Зорачкі”. Вось і маем вынік: пасеянае дае добры ўраджай.

Цяпер у маладых удзельніц гурта беларускай песні “Купалінка” — пара экзаменаў у каледжах, іх паспяхова здаюць Аліна Паўлава і Вераніка Нікуліна. А самыя юныя ўдзельніцы гурта “Зорачкі” Марыя Шылкіна і Валерыя Пыціна адсвяткавалі свой першы выпускны: у дзіцячым садзе . Марыя пойдзе далей у гімназію і музычную школу, і яе сяброўка рыхтуе школьны ранец.

Пры ўсёй летняй настроенасці на адпачынак мы — у выдатнай творчай форме. І 12 чэрвеня, калі адзначаўся Дзень Расіі, удзельнічалі ў шматнацыянальнай канцэртнай праграме “Россия — родина моя”. На пляцоўку ў Аўтазаводскім раёне, дзе выступалі гурты нацыянальна-культурных цэнтраў, прыйшло шмат людзей. Гучалі вершы пра Расію, выступала наша “Купалінка”, як кажуць, у абноўленым фармаце. І песні ў нас новыя, саліравалі ж са мною разам Аліна Паўлава і Вераніка Нікуліна. Для такога складу ансамбля гэта ўжо трэцяе канцэртнае выступленне ў Парку Перамогі. Мы яшчэ выступалі на святочных канцэртах у Дзень абароны дзяцей і на Дні горада.

“Россия — родина моя”... Так могуць сказаць мільёны людзей розных нацыянальнасцяў. Так гаворым і мы, беларусы Паволжа, бо нашы дзеці, унукі тут нарадзіліся. Увогуле ва ўсім свеце анідзе, бадай, няма такога, каб у краіне жылі людзі адной нацыянальнасці. Значыць, усім трэба вучыцца жыць з любоўю да свайго ды з павагаю да чужога. Дарэчы, і вядомы рускі паэт, з радкоў якога я пачала допіс — яўрэй па нацыянальнасці. А ёсць у яго родавыя карані ў Беларусі — пра тое была публікацыя “Карані роду Самуіла Маршака” ў газеце “Голас Радзімы” (9.08.2012). Мяркую, яркім пацвярджэннем таго, што менавіта беларусы ўмеюць гарманічна развівацца ў цяперашняй шматмоўнай культурнай плыні, можа быць нядаўні поспех беларускіх настаўнікаў рускай мовы на конкурсе ў Маскве. На Міжнародным Пушкінскім конкурсе настаўнікаў-русістаў, вынікі якога нядаўна падвялі, лаўрэатамі сталі ажно шэсць прадстаўнікоў Беларусі. Гэта, як пішуць журналісты, найлепшы вынік сярод удзельнікаў, бо напрыклад, з Казахстана ці Грузіі — па пяць пераможцаў, з Украіны — чатыры, з Узбекістана — тры. Гэта яскравы “меседж”, як цяпер кажуць, тым расійскім палітыкам, якія спрабуюць убіць клін паміж нашымі народамі: маўляў, Беларусь арыентуецца цяпер толькі на Захад. Мы гаворым на адной мове — што можа лепш сімвалізаваць нашае моцнае сяброўства! Пры тым, аднак, варта памятаць: і родную беларускую мову, культуру мы гатовы бараніць ад “размывання”, “выціскання” на задворкі жыцця з той жа рашучасцю, як і адстойваць незалежнасць Бацькаўшчыны. Бо, як вядома, гэта рэчы — узаемазвязаныя.

Вось таму, дарэчы, мы вельмі цэнім рознага роду кантакты з Беларуссю: яны заўсёды даюць новы зарад энергіі для дзейнасці. На бліжэйшы час у “Нёмана” шмат цікавых планаў. Сярод іх — рэпетыцыі па вакале, харэаграфіі, сцэнічнай мове: імкнемся ўдасканальваць майстэрства. А ў ліпені паедзем у Беларусь: сябры і партнёры з Ваўкавыска запрасілі на святкаванне 1010-годдзя горада. Прычым акрамя “Купалінкі” збіраюцца ў цікавую вандроўку ўдзельнікі гурта “Зорачкі”, упершыню едзе з намі і харэаграфічны гурт “Лицей” з ліцэя мастацтваў. І гэта здорава, што даўняе сяброўства творчых беларускіх гуртоў суполкі з ліцэем мастацтваў урэшце перарасло ў творчы саюз. Мяркую, ён таксама вельмі сімвалічны! Бо калі гучаць беларускія народныя песні з удзелам, з падтрымкай расійскага харэаграфічнага ансамбля — гэта пры добрай рэжысуры можа стаць тэатралізаваным прадстаўленнем.

Людміла Дзёміна,
старшыня праўлення суполкі
“Нёман”, г. Тальяці

ВІНШУЕМ!

Пакрыўджаных не будзе

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Уражваюць грунтоўныя матэрыялы, якія даслалі таксама іншыя ўдзельнікі. Журы разглядала падрабязныя справаздачы пра дзейнасць за год у выглядзе газетных публікацый, відэа- і аўдыёзапісаў, фотаальбомаў і мультымедыйных прэзентацый. Іх даслалі супляменнікі з казахстанскіх Паўладара і Астаны, латвійскіх Даўгаўпілса, Екабпілса, Елгавы, расійскіх Валгаграда, Кургана, Томска, Новасібірска, Іркуцка, Тальяці, Цюмені, Растова-на-Доне... З Казані ў конкурсе ўдзельнічала суполка “Спадчына”, з Клайпеды — “Крыніца”. Асобным салідным пакетам паступілі матэрыялы ад Саюза беларусаў Латвіі. А з Эстоніі вылучыўся Цэнтр вучобы і развіцця EVA.

Усяго ж у конкурсе-2015 было амаль 20 удзельнікаў. І вось наступны сказ, я мяркую, вызаве мора станоўчых эмоцый у актывістаў гэтых беларускіх суполках. “Дыпломамі Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур і таварыства “Радзіма”, а таксама каштоўнымі падарункамі мы ўзнагароджаем усіх сёлетніх канкурсантаў, — запэўніў дырэктар РЦНК Міхаіл Рыбакоў. — Звычайна падыход да вызначэння ўзроўню ўзнагарод дыферэнцаваны (у залежнасці ад грунтоўнасці конкурсных матэрыялаў), але сёлета ўсе дасланыя матэрыялы — цікавыя і разнастайныя”. Што ж, пакрыўджаных не будзе. Ды й мэта конкурсу, па словах кіраўніка Цэнтра, не размеркаванне суполак па нейкіх месцах, а жаданне заахвоціць супляменнікаў за межамі Беларусі актыўней займацца творчай справай: пашыраць беларускую культуру ў свеце. Гэта і магчымасць расказаць пра сябе і свае справы, падзяліцца досведам працы з іншымі.

Нагадаем, конкурс “Культура” сярод грамадскіх суполак беларускіх супляменнікаў за мяжой на лепшыя дасягненні ў арганізацыі і рэалізацыі праектаў па папулярызацыі беларускай культуры ў краінах, дзе жывуць нашы супляменнікі, праводзіцца з 2012 года. Кожны з удзельнікаў мінулых этапаў конкурсу адзначаны дыпломамі ці падзячнымі лістамі арганізатараў, прызамі. Дарэчы, летась узнагароды большасць удзельнікаў атрымалі пад час правядзення другога Фэсту мастацтваў беларусаў свету ў Мінску, што таксама падкрэслівае важнасць культурніцкай дзейнасці нашых супляменнікаў за мяжой. А сёлетнія ўзнагароды некаторым лаўрэатам уручаліся і ў Маскве, на VI з'ездзе Фэдэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі “Беларусы Расіі”.

Праект выклікае вялікую цікавасць сярод беларусаў замежжа. Для лепшага ж інфармавання суайчыннікаў “Голас Радзімы” стаў інфармацыйным спонсарам конкурсу “Культура”. Мы будзем і надалей расказваць пра ўдзельнікаў, прадстаўляць паводле дасланых матэрыялаў станоўчы досвед працы.

ІВАН ЖДАНОВІЧ

Любоў Адаскевіч і Ніна Кабанава з дыпломамі лаўрэатаў

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

Летапіс пад вокладкай

У Даўгаўпілсе прэзентавалі кнігу “Уздым” на пачатку 21 стагоддзя”

Газета паведамляла: падзея адбылася пад час Дзён беларускай культуры. Актывісты суполкі ды сябры, госці сабраліся ў Цэнтры беларускай культуры. Было што сказаць, успомніць, спявалі разам любімыя беларускія песні. У Даўгаўпілсе ўжо 22 гады дзейнічае беларускае таварыства, якое заснавалі энтузіясты, нераўнадушныя да роднай мовы, культуры. У гісторыі суполкі пакінулі свае старонкі дзясяткі супляменнікаў. Тое бачыш, гартаючы новае выданне. Першае, “Летапіс“Уздыму”, выйшла да 10-годдзя, рэдактар — Таццяна Бучэль.

Наша суполка багатая на добрых, таленавітых людзей. У ёй ёсць педагогі, паэты, спевакі, лекары, мастакі, работнікі сферы паслуг. Ёсць пенсіянеры і моладзь. Іх справам і прысвечана кніга, выйсці якой дапамагла Даўгаўпілская краёвая дума. На выдзеленыя грошы створана і песня “Астравок Беларусі” (аўтары Станіслаў Валодзька і Таццяна Піменава), прысвечаная… Генконсульству Беларусі ў Даўгаўпілсе.

Крэатыўна! Песня гучала ўпершыню ў выкананні трыа “Ластаўкі” (Таццяна Піменава, Вера Талерка, Наталля Зубкова). Консул Юры Давыдоўскі, прымаючы дар, парадаваўся за супляменнікаў, казаў: “Уздыму” ёсць пра што весці летапіс, бо гэта самая актыўная суполка беларусаў Латвіі. Мы ж — пераемнікі традыцый “Бацькаўшчыны”: такая суполка працавала ў Латгаліі да вайны.

Стваральнікаў кнігі дзякавалі старшыня праўлення таварыства Валеры Амбросаў, кіраўніца Цэнтра беларускай культуры Жанна Раманоўская. Апошняя адзначыла: ва “Уздыму” ёсць і сайт у інтэрнэце, і кніга, плануецца і выпуск газеты для беларусаў Латгаліі. Зінаіда Сіліня згадвала пра першыя гады працы суполкі, спявала любімую песню “Там шэры конь бяжыць...”. Зацікавіла выданне доктара навук Таццяну Кузняцову з Даўгаўпілскага ўніверсітэта, літаратуразнаўцу і паэта Валянціна Лукашэвіча. Краязнаўца Іварс Логінс павіншаваў нас з падзеяй, падараваў зборнік нарысаў па латгальскай гісторыі.

Аўтары новай кнігі — актывісты “Уздыму”. У ёй ёсць нарыс Мікалая Паўловіча пра беларускія мясціны Даўгаўпілса. Станіслаў Валодзька распавядае пра першыя крокі суполкі. Багата статыстыкі, можна прасачыць дынаміку росту суполкі, яе нацыянальны склад, узровень адукацыі членаў, іх узрост, веравызнанне — матэрыял Людмілы Сіняковай. І кіраўнікі творчых гуртоў, іх удзельнікі распавядаюць пра сваю дзейнасць. Аўтары зборніка атрымалі ў падарунак кнігі, ручкі з лагатыпам “Уздыму”.

Людміла Сінякова,
г. Даўгаўпілс

СУПЛЯМЕННІКІ

Шляхам святла і прыгажосці

Мастачка з беларускім родавымі каранямі Любоў Тарлецкая, якая жыве ў Латвіі, прысвяціла сваю выставу святому Мікалаю Цудатворцу

Напрыканцы мінулага года ў латышскім горадзе Дагда, у памяшканні беларускага таварыства "Вербіца" ладзілася выстава карцін жыхаркі Краславы Любові Тарлецкай. Прысвячалася яна Мікалаю Цудатворцу. Такі незвычайны праект мы арганізавалі супольна са святаром Віктарам (Мялікам) ды актывісткай Нінай Тарарака. На вернісажы айцец Віктар цікава расказваў пра святіцеля Мікалая, яго цуды, разважаў аб прыгажосці прыроды і ўхваліў намаганні тых людзей, якія ўмеюць перадаць яе ў творчасці. Любоў Тарлецкая — з іх ліку. Свет яна пабачыла далёка ад радзімы бацькі-беларуса ды маці-рускай: ва Уладзікаўказе. У дзяцінстве талентамі асаблівымі не вызначалася, аднак любіла спяваць, хадзіць з бацькамі ў музеі, разглядаць там карціны ды пад іх уражаннем марыла і сама навучыцца маляваць. Але жыццё з выяўленчым мастацтвам не звязала. А ў 65, ужо на пенсіі, наша супляменніца стала пастаяннай прыхаджанкай у царкве, дзе служыць айцец Віктар, пачала спяваць на клірасе. Потым па волі Усявышняга, як сама лічыць, пазнаёмілася ў інтэрнэце з грэчаскім мастакам-іканапісцам Іракліем Пасхалідзі. Гэты чалавек і ўклаў у яе рукі пэндзаль, стаў своеасаблівым куратарам на шляху творчасці. У жанчыны адкрыўся дар, на здзіўленне самой Любові, яе сям'і ды знаёмых. За велізарную падтрымку яна ўдзячна мужу Барысу, які сам — фатограф.

За год Любоў Тарлецкая напісала 30 карцін, на іх у асноўным — прырода Латгальскага краю, але ёсць паўднёвае мора і паўночныя льды, горныя вяршыні, ранішнія туманы, жывёлы і птушкі, гарадскія краявіды і біблейскія сюжэты. Памяшканне, дзе працуе наша таварыства, невялікае, але светлае і ўтульнае. Людзі прыходзілі групамі. Цікавай для Любові была сустрэча са старшакласнікамі. Яны задавалі розныя пытанні: як пішуцца туманы? Як напісаць, каб вада была празрыстаю? Адкуль бяруцца сюжэты? У адказ на апошняе пытанне мастачка прачытала верш Іосіфа Бродскага "Сретение" ды так, што стала зразумела: на хвалі высокіх, моцных пачуццяў многае магчыма.

Выставай засталіся задаволеныя ўсе. Нам жа, арганізатарам, было прыемна сустрэць на ёй і прадстаўнікоў гардумы Дагды. "Я вельмі ўдзячная ўсім, хто не застаўся абыякавым да маёй творчасці, — казала нам на развітанне Любоў Тарлецкая. — Я пішу так, як падказвае сэрца. Радуюся, калі бачу ў вачах гледачоў дабрыню і светлыя пачуцці. Гэта так здорава!"

Таццяна Гогалінская, старшыня суполкі "Вербіца", г. Дагда

Дар мастачкі ў Любові Тарлецкай адкрыўся ў сталыя гады

Ад рэдакцыі.

У допісе спадарыні Таццяны, падалося нам, не хапае важных дэталяў. Скажам, як гэта мастачка-супляменніца раптам у тэксце "перескоквае" з уладзікаўказкага дзяцінства ў дагдзінска-краслаўскае 65-годдзе? Хацелася даведацца пра яе жыццё, спецыяльнасць, і адкуль канкрэтна родавыя карані. Па нашай просьбе Таццяна адрасавала пытанні самой Любові, а потым і пераслала яе аповед пра сябе. Падаем яго са скарачэннямі асобным тэкстам пад назвай "Бабулін ручнік вышываны".

Бабулін ручнік вышываны

Нарадзілася я ў 1947 годзе ў Паўночнай Асеціі. Мой тата, Іван Васільевіч Лапікаў — беларус, родам з вёскі Бабры Гарадоцкага раёна Віцебшчыны. Пад час вайны ўся вёска тая была спалена, і сям'я хавалася ад ворагаў па суседніх, у сваякоў. На фронце ваявалі і мой тата, і старэйшы ягоны брат Іосіф. Тату прызвалі ў 1944-м, ён быў разведчыкам у артылерыйскіх і мінамётных часцях. Канец вайны сустрэў у Кёнігсбергу, а вайсковую службу сваю закончыў у Грузіі. Перад тым, як вярнуцца дадому, у Беларусь, вырашыў пагасціць у брата Іосіфа, які ўжо на той час ажаніўся з церскай казачкай і жыў у Асеціі. Доўга, расказваў мне, гутарылі браты. Іосіф разважаў прыкладна так: "Куды табе ехаць? Хаты ж няма. Брат малодшы, Канстанцін, толькі ажаніўся — і пайшоў жыць да жонкі разам з бацькамі. А сястра Тамара ў Латвіі жыве… Куды пойдзеш? Заставайся ў мяне: край багаты, землі ўрадлівыя, ажэнім цябе тут…"

Карацей, тата мой да радзімы так і не дабраўся: асеў на Каўказе. Бацькі яго жылі з малодшым сынам у вёсцы Біцелева пад Віцебскам (яна часткова збераглася, цяпер уключана ў гарадскую рысу і дала назву мікрараёну Біцелева-1 ва ўсходняй частцы абласнога цэнтра. — **Рэд.**). А калі бабуля засталася адна, то вельмі затужыла па сынах на Каўказе. І яе, ужо слабенькую, прывезлі да нас. Памятаю, было тады мне гадоў пяць. Сярод няхітрых бабуліных пажыткаў аказалася адна рэч, якая прыводзіла мяне ў захапленне. Глядзела на яе — і здавалася, што анічога прыгажэйшага няма на ўсім свеце.

Мастацкая выстава ў Дагдзе — радасная падзея ў жыцці былой настаўніцы музыкі

Гэта быў вышыты на саматканым палатне чырвона-чорнымі ніткамі ручнік.

І пазней, ужо дарослай, я часцяком даставала яго, любавалася і думала: як такую прыгажосць могуць стварыць чалавечыя рукі! Грэла душу і тое, што гэты цуд зрабілі рукі маёй роднай бабулі. Тата ж мой быў чалавекам вельмі кампанейскім: вакол яго збіралася заўжды шмат людзей. Ды асаблівай увагай надзялялі яго землякі-беларусы, якія часта збіраліся ў нас. Спявалі свае песні, шмат распавядалі пра вайну, свае родныя мясціны. Тыя бяседы ў памяці маёй — на ўсё жыццё…

У 1967-м я закончыла музычна-педагагічнае вучылішча, пачала працаваць настаўніцай музыкі ў агульнаадукацыйнай школе. Потым паступіла ў Паўночна-Асяцінскі дзяржуніверсітэт імя К. Хетагурава: геаграфічны факультэт закончыла ў 1976-м. Далей асноўныя гады працоўнай дзейнасці прайшлі ў дзіцячым садзе: працавала і выхавальніцай, і музработніцай. Песні, танцы, вершы… Пісала і сцэнары святаў. Перад пенсіяй і ў школе вяла ўрокі музыкі. Што да жывапісу, то гэта была мая даўняя мара. І яна стала явай дзякуючы выпадковаму знаёмству ў інтэрнэце з Іракліем Пасхалідзі. Гэта светлы чалавек, які вядзе на тэлебачанні майстар-класы па жывапісе — у Грэцыі. Мы з ім маем зносіны на рускай мове. Менавіта ён проста прымусіў мяне ўзяць пэндзаль у рукі ды адчуць радасць і асалоду ад мастакоўскай працы. Я ўвогуле, як кажуць, схіляю галаву перад творчымі людзьмі. Сама ж умею вышываць крыжам і роўняддзю, магу ляпіць, плесці з лазы, а цяпер і карціны пішу. Свою першую выставу абяцала прысвяціць свайму настаўніку, і абяцанне выканала. Вялікая дапамога і падтрымка ідзе ад мужа, Барыса Тарлецкага. У інтэрнэце ёсць відэа з выставы, хоць і знята аматарскай камерай, ды глядзець — прыемна.

Цяпер пра тое, чаму выстава ў Дагдзе прысвечана святіцелю Мікалаю Цудатворцу. Бо храм у тым горадзе носіць яго імя. Храм пад час вайны, праўда, згарэў, і службы вядуцца ў ахвяраваным для гэтай мэты жылым доме. Айцец Віктар Мялік, беларус па родавых каранях, прыкладае шмат сіл, каб выбудаваць новы храм, а прыхаджане ў ім — у асноўным беларусы: вельмі дружныя і спагадныя людзі. Выстава ладзілася да жаночага свята 8 Сакавіка. Хачу дадаць, што айцец Віктар адзін з першых даведаўся пра маё захапленне маляваннем і даў мне сваё дабраславенне. Аднойчы ён папрасіў прывезці ўсе карціны ў храм. Я была вельмі здзіўленая, але просьбу выканала. Пасля асноўнай службы ён выставіў мае карціны ў храме, адслужыў малебен і асвяціў іх. Потым карціны выставілі ў бібліятэцы, дзе праходзіла вечарына духоўнай музыкі. Я чытала вершы, а ўвесь наш клірас спяваў духоўныя хваласпевы. Таксама былі ў зале каталікі, лютэране і стараверы.

Спяваю я ўсё жыццё, колькі сябе памятаю: спачатку — у школьным хоры, потым — у ансамблях народнай песні. Спяваем мы рускія, беларускія песні. У інтэрнэце мяне можна знайсці ў "Одноклассниках" на старонцы "Любовь Тарлецкая (Лапикова)": там ёсць рэпрадукцыі карцін, фотаальбомы — хто жадае, можа заглянуць туды.

Любоў Тарлецкая, г. Краслава

ЯК СПРАВЫ, ДЫЯСПАРА?

З першым годам!

(Заканчэнне. Пач. на стар. 1)

Святло ад “Каляднага свята”

Мы правялі “Каляднае свята” ў Пасольстве Беларусі. Гэта новы, знакавы імпульс для пашырэння і развіцця беларускіх Калядных традыцый, беларускай мовы ў Малдове. І прыклад таго, як плённа можа ісці, ды і ўжо ідзе супраца Пасольства і актывістаў БКРМ, усёй дыяспары. Упершыню дзеці беларусаў Малдовы, а з імі і дарослыя былі на Навагодняй ёлцы ў Амбасадзе, атрымалі падарункі і масу ўражанняў, эмоцый. Супольна з Амбасадай мы пачалі рухацца плённым шляхам і далей: прадставілі “Беларускі павільён” на навагоднім дабрачынным кірмашы ў выставачным цэнты “Moldexpo”, правялі майстар-клас “Туканне Вясны” для малых і дарослых беларусаў Малдовы. Ёсць і новыя сумесныя планы.

Цяпер БКРМ акрэдытаваны пры Бюро міжэтнічных адносін Малдовы, сябра Кардынацыйнага савета этнакультурных аб’яднанняў пры Бюро. Такое ўзаемадзеянне спрыяе ўдзелу суполкі ў значных мерапрыемствах: Дні славянскага пісьменства і культуры, Фестывалі этнасаў. І таму беларускі народ, яго культура яшчэ шырэй прадстаўлены ў Малдове, больш упэўнена гучыць тут беларуская мова.

Старшыня праўлення БКРМ вітала ўдзельнікаў Першага форуму нацменшасцяў Малдовы. І афіцыйны візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Малдову стаў для беларусаў Малдовы ў поўным сэнсе гістарычным. Бо 25 верасня 2014 года ў нас была сустрэча з Прэзідэнтам.

Першы год жыцця БКРМ — гэта і ўдзел актывістаў у розных канферэнцыях,

За святочным сталом

семінарах. Мы наладзілі кантакты з шэрагам дзяржаўных і недзяржаўных СМІ ў Малдове і Беларусі. Актывісты паўдзельнічалі ў розных тэле- і радыёпраграмах, выходзілі сюжэты і рэпартажы пра дзейнасць БКРМ — як у Малдове, так і ў Беларусі. Плённа развіваецца супраца з Генадзем Зяньковічам, які робіць унікальную (рэспубліканскую!) радыёперадачу “Беларуская Крыніца”: выходзіць штомесяц на “Радыё Малдова”. У апошнім выпуску мы з ім былі сувядучымі. Дзякуем за інфармацыйную падтрымку нашых праектаў газеце “Голас Радзімы”, бюлетэню “Беларусы ў свеце”.

Год таму наш Рух распачаў цікавы праект “Дзверы да этнічных каранёў”: азнаямленне дзяцей і моладзі замежжа з беларускімі родавымі каранямі, з культурай іх гістарычнай радзімы — Беларусі. Спадзяемся, да такой важнай справы з часам падключацца і грамадскія, а таксама дзяржаўныя арганізацыі Беларусі.

“Куфар”: сімвал багацця

Актывісты БКРМ маюць унікальны досвед правядзення этнічных спектакляў паводле старажытных абрадаў. Маем 4 пастаноўкі, цалкам на беларускай мове: “На Каляды”, “Туканне Вясны”, “Вясновы Кліч” і “Каляднае свята”. А ў якасці каштоўнага падарунка аб’яднанню (ну трэба ж імяніннику нешта дарыць!) праўленне БКРМ прыняло рашэнне: стварыць Народны беларуска-малдаўскі этнічны тэатр “Куфар”. Дарэчы, гэта вельмі сімвалічна: слова “Куфар” у беларускай і малдаўскай мовах гучыць аднолькава. Гэта такі “прадмет корпуснай мэблі” (раней казалі: скрыня) з адкідной ці здымнай верхняй крышкай-накрыўкай. Куфар — сімвал чагосьці каштоўнага, свяшчэннага. У ім звычайна зберагаюць скарбы і тое, што прызначана для захавання, перадачы ў спадчыну. Гэта і сімвал пераемнасці. Для нас “Куфар” — сімвал велізарнага багацця беларускіх і малдаўскіх культурных традыцый, якія мы жадаем захоўваць і пашыраць, спрыяць іх збліжэнню, узаемадзеянню, узаемаўзбагачэнню.

Яшчэ сведчанне таго, што за год Беларускі культурны рух Малдовы цвёрда стаў на ногі. Сёлета ў сакавіку ў сувязі з прыняццем новага Закона Рэспублікі Беларусь №162-З “Пра беларусаў замежжа” Міністрам замежных спраў Беларусі быў падпісаны загад аб зацвярджэнні складу Кансультацыйнага савета па справах беларусаў замежжа пры МЗС Беларусі. І старшыня праўлення БКРМ увайшла ў склад гэтага Савета. Цяпер наша суполка рыхтуе свае прапановы да першага пасяджэння Кансультацыйнага савета, якое прызначана на 1 ліпеня. Таксама ў сувязі з распрацоўкай Дзяржаўнай праграмы “Беларусы ў свеце на 2016-2020 гады” праўленне Руху накіравала шэраг прапаноў па магчымых значных мерапрыемствах для беларускай дыяспары ў Малдове.

Дзейнасць БКРМ у першую чаргу скіраваная на захаванне, вывучэнне, развіццё і пашырэнне беларускай культуры, нашай мовы, гісторыі, традыцый, звычаяў, нацыянальнай і этнакультурнай самабытнасці, духоўных і маральных каштоўнасцяў беларускага народа. Мы імкнёмся да сімбіёзу (гэта значыць: узаемакарыснага суіснавання) культур беларускага і малдаўскага народаў. Спрыяем умацаванню двухбаковых сяброўскіх стасункаў паміж Малдовай і Беларуссю. Мы — за развіццё міжкультурнага дыялогу, сяброўскіх стасункаў паміж беларускім народам і прадстаўнікамі іншых этнасаў і супольнасцяў, якія жывуць як на тэрыторыі Малдовы, так і за яе межамі. Як бачна, мэты Беларускага культурнага руху Малдовы цалкам сугучныя з ідэяй пра тое, што для стабільнасці і працвітання ў шматнацыянальнай дзяржаве варта ў непарыўнай сувязі весці патрыятычнае выхаванне — і адначасова падвышаць культуру міжнацыянальных зносін, выхоўваць дзяцей і моладзь у духу братэрства, дружбы народаў.

ВІТАЛІЙ МАЗУР

Юнае пакаленне беларусаў Малдовы — таксама ўдзельнікі свята

Ганна Мазур,
старшыня праўлення Беларускага культурнага руху Малдовы

СУСЕДЗІ

Музычныя дыялогі з Кракавам

Рыгор Арэшка

Кампазітар Яўген Паплаўскі не толькі піша музыку, але і паглыбляе пры яе дапамозе беларуска-польскае культурнае супрацоўніцтва

Нашы супляменнікі з Польшчы паведамілі ў рэдакцыю: гэтай вясною ў Кракаве прайшоў Аўтарскі канцэрт кампазітара Яўгена Паплаўскага. Дарэчы, пра канцэрт у Беларускай дзяржфілармоніі мы пісалі — а што было ў Польшчы? “Аўтарскі канцэрт прайшоў вельмі добра, знаходжуся пад моцным уражаннем, — ахвотна патлумачыў кампазітар. — Праграма была такая: Path in the Clouds III для фартэпіяна і струннага аркестра (2008), Missa brevis для жаночага хору без суправаджэння у 5 частках (2015) і “Лунаючы у прасторы для камп’ютара” (1999)”.

Па словах Яўгена, гэта быў другі ягоны Аўтарскі канцэрт у Польшчы. Ён, нагадаем, член саюзаў кампазітараў і Беларусі, і Польшчы, прычым адносіцца да Кракаўскага аддзялення. І менавіта адтуль у 2013-м атрымаў замову: напісаць цыкл “Пожні” для змешанага хору без суправаджэння на словы Уладзіміра Жылкі і Ларысы Геніюш у 5 частках. “Калі партытура была гатовая, узнікла ідэя: паказаць твор, правесці першы Аўтарскі канцэрт у Кракаве, — удакладніў кампазітар. — Цыкл, дарэчы, выконваў вакальны ансамбль SINGET, дырыжор якога, Марыя Янушкевіч, паходзіць з Мінска, з вядомай мастацка-творчай сям’і Янушкевічаў. У праграме канцэрта, які прайшоў 15 снежня 2013 года, быў і цыкл “Ноч” на словы Алеся Гаруна для барытона і фартэпіяна. Як вядома, беларускі паэт памёр і пахаваны ў Кракаве, на Ракіцкіх могілках. А сольную партыю ў “Ночы” спяваў ураджэнец Ваўкавыска Аляксандр Бардасаў”.

Яшчэ адзін цікавы “беларускі акцэнт” аказаўся ў першым канцэрце: гучала “Музыка памяці ксяндза, доктара тэалогіі Станіслава Глякоўскага” для альта, фартэпіяна і струннага аркестра. Выконваў яе аркестр KN, дырыжор Станіслаў Краўчыньскі. Дарэчы, удакладняе Яўген Паплаўскі, “ксёндз Глякоўскі — гэта родны брат маёй бабулі. Вельмі цікавая асоба, пра яго ёсць тэксты ў інтэрнэце”. А знакам павагі да слухачоў, якія любяць эксперыменты, у канцэрце была… электронная сімфонія “Карозія часу”: Яўген напісаў твор у 1999-м у Студыі электраакустычнай музыкі Акадэміі музыкі ў Кракаве.

“Імпульсам, каб правесці другі Аўтарскі канцэрт у Кракаве, паслужыла просьба знакамітага дырыжора, шматгадовага рэктара Акадэміі музыкі ў Кракаве (2004-2012) Станіслава Краўчыньскага пра напісанне Імшы для жаночага хору

Фрагмент канцэртнай афішы

без суправаджэння, — прыадкрывае падрабязнасці сёлетняга праекта Яўген Паплаўскі. — Мною былі выбраны 5 кананічных тэкстаў на лацінскай мове Каталіцкай імшы: Kyrie, Gloria, Sanctus, Benedictus і Agnus Dei. І паколькі апушчана частка Credo, то Імша няпоўная — вось і называецца Missa brevis. Маэстра Краўчыньскі прапанаваў яшчэ ўключыць у праграму канцэрта твор Path in the Clouds III (Шлях у Аблокі) для фартэпіяна і струннага аркестра (2008, прысвечаны Фрыдэрыку Шапэну).

Кантрастам да акустычных партытур у канцэрце, дадае Яўген Паплаўскі, паслужыла выкананне электроннага твора “Лунаючы ў прасторы для камп’ютара” (1999) — ён рэалізаваны ў Студыі электроннай музыкі Акадэміі музыкі ў Кракаве.

ВЕДАЙ НАШЫХ!

Пра што гаворыць “говор”

Іван Іванаў

Беларускія настаўнікі рускай мовы сталі лепшымі на конкурсе ў Маскве

Прыемная вестка: у Міжнародным Пушкінскім конкурсе настаўнікаў-русістаў лаўрэатамі сталі 6 прадстаўнікоў Беларусі. Сярод пераможцаў — Наталля Папкова з Ліды, вызначыліся таксама педагогі Маргарыта Багдановіч, Васіль Маліноўскі, Святлана Назарава, Святлана Сіяновіч і Ларыса Таркіна.

Для такіх поспехаў у Беларусі ёсць моцная гістарычная аснова. У артыкуле “Великий белорусский язык”, які лёгка знайсці ў інтэрнэце, ёсць спасылкі на Уладзіміра Даля. Аўтар папулярнай і цяпер кнігі “Великорусское наречие русского языка” — назва першага выдання — пісаў: прыкметы беларускай мовы пачынаюцца адразу пры выездзе з Масквы. Гэтае маўленне “идет от Москвы на запад и незаметно переходит в чистое белорусское, на которое уже значительно намекает даже говор в Волоколамске, Рузе, Можайске”. Як бачым, уплыў нашай мовы на фармаванне рускай і раней быў моцным і відавочным.

Заснавальнік: Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск
Рэдактар Віктар Міхайлавіч Харкоў
Адрас рэдакцыі: пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61. Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Бюро па рэкламе: Тэл. +375 17 290 60 11
Тэлефон рэдакцыі: +375 17 288 17 82; факс: +375 17 290 68 31
E—mail: golas_radzimy@tut.by
Аб’ём выдання: 1 друк. арк.
Тыраж: 1940, **Заказ:**
Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск
Час падпісання ў друк: 20.10
Выходзіць 1 раз на тыдзень
Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках “Голасу Радзімы”, могуць не супадаць.
© “Голас Радзімы”, 2015